Луцкевіч, Лявон
Войцік, Галіна
**“Станіслаў Станкевіч”**
(сэрыя “Партрэты Віленчукоў”)
Вільня, 2001

рэдактар *Алег Мінкін*
тэхнічны рэдактар *Яўген Кеппул*

Віленскі цэнтар грамадзкіх ініцыятываў
“Дэмакратыя для Беларусі”
*2001 Vilnius, a/d 1021, Lithuania*
*http://www.runbel.lt*

Наклад 100



KAMUNIKAT.org

# 1907 — 1980

УДК 882.6-94
В 65

Станіслаў Станкевіч (1907-1980), выдатны беларускі літаратуразнаўца, буйны грамадзкі дзеяч ў Заходняй Беларусі й на эміграцыі, рэдактар часопісу "Рух", газэтаў "Бацькаўшчына" й "Беларус". Гэтае выданьне прафінансаванае Раісай Станкевіч і Антонам Шукелойцем.

ISBN 9955-427-10-8
© Галіна Войцік

апошнім часам, сваімі меркаваньнямі пра чародны, калядны нумар "Беларуса", чытаў неперабіты яшчэ на машынцы рукапіс — канчатак кнігі пра Янку Купалу. А раніцай у чацьвер 6-га, змучаны недамаганьнямі апошніх дзён, прылёг адпачыць на гадзіну-другую, зазначыўшы перад тым у гутарцы з жонкай, што, устаўшы, будзе мець яшчэ спакойны дзень працы. Задаволена заснуў. Але гадзіна-другая сну сталася вечным супачынам"...

Жыцьцёвы шлях Стася Станкевіча пачаўся ў Арлянятах на Ашмяншчыне й закончыўся далёка за акіянам у Нью Ёрку. На ягоным жыцьцёвым шляху былі этапы: Вільня. Навагрудак, Барысаў, Нямеччына й апошні — Злучаныя Штаты Амэрыкі. Віленскі этап ахапіў навуку ў ВБГ і ў Віленскім Унівэрсытэце. Нібыта й невялікі адрэзак часу, але менавіта ў Вільні Ст. Станкевіч сфармаваўся, як сьведамы беларус, як публіцыст і літаратуразнаўца. Тут ён выбраў свой шлях да волі, шлях служэньня Бацькаўшчыне словам і пяром, — і ня збочыў з гэтага шляху праз усё сваё жыцьцё. А што да ягонага ўкладу ў беларускае літаратуразнаўства, дык калі-б сабраць усё напісанае Ст. Станкевічам, пачынаючы ад ягоных першых артыкулаў у "Студэнцкай думцы", "Калосьсі", "Нёмане", "Маладой Беларусі", "Бацькаўшчыне", "Беларусе", сабраць ягоныя працы, надрукаваныя ў іншых выданьнях і ў асобных кнігах, — дык атрымалася-б некалькі дыхтоўных, надзвычай карысных для беларускага чытача тамоў. А яшчэ шматлікія лекцыі, даклады, рэфэраты...

беларускім савецкім друку яго называлі "здраднікам", "ворагам народу" й пад. Калі ў ЗША пачалі прыяжджаць беларускія пісьменьнікі й партыйныя дзеячы, здараліся кур'ёзныя сытуацыі. У кнізе "Беларуская Амэрыка" Леаніда Пранчака (Менск, 1994) зьмешчанае інтэрвію аўтара зь Сяргеем Карніловічам, які згадвае, пару гэткіх сытуацыяў. Падчас згаданай ужо выставы ЭКСПО 1969 г. у складзе бел. дэлегацыі быў Лявон Яўменаў, які арганізаваў кніжную выставу. Аднаго дня на выставу прыйшоў Ст. Станкевіч. Назваўшыся не сваім прозьвішчам, а нейкім Сеўруком ці Сідаруком, пачаў гаварыць і вельмі ўразіў Яўменава сваёй дасьведчанасьцю ў галіне бел. савецкай літаратуры. Апошні, ня ведаючы, хто перад ім, захацеў пазнаёміць яго з Танкам. Падвёў Танка да Станкевіча й кажа: "Будзьце знаёмыя". Яны глянулі адзін на аднаго. Танк кажа: "Здароў, Стась". А Станкевіч у адказ: "Здароў, Яўген". І разыйшліся. А Яўменаў ажно рот разявіў: "Гэта-ж той самы Станкевіч, якога саветы патрабуюць у Амэрыкі як ворага народу!" І яшчэ. "Станкевіч быў цікавым чалавекам. Нейкім чынам трапіў ён на бел-прыняцьце. Быў там і Ціхан Кісялёў, тагачасны Старшыня Рады Міністраў БССР. Ці ведаў ён што пра Станкевіча, ці не — невядома. Але здарылася так, што Стась на гэтым прыёме падняў тост за вольную Беларусь. І Кісялёў таксама піў за яго тост".

Апрача працы рэдактарам "Беларуса" й на радыё "Свабода" Ст. Станкевіч выступае, як колісь у Вільні, а пасьля ў Нямеччыне, з дакладамі й лекцыямі. Апрача таго працуе над дзьвюма кнігамі з галіны бел. літаратуразнаўства. Адна зь іх, "Беларуская падсавецкая літэратура першае палавіны 60-ых гадоў" выйшла ў 1967 г., другая, "Янка Купала. На сотыя ўгодкі ад дня нараджэньня" — ў 1981 г.

Памёр Станіслаў Станкевіч 6 лістапада 1980 году. Пахаваны на беларускіх могілках у Іст Брансьвіку. У №№ 238, 239 "Беларуса" за лістапад-сьнежань 1980 г. амаль тры старонкі прысьвечаныя памяці Ст. Станкевіча. "Нам, ягоным супрацоўнікам праз доўгія гады, — піша Кастусь Акула, — а таксама ўсім руплівым у справе беларускага адраджэньня суродзічам па эміграцыі і ў паняволенай Бацькаўшчыне мала сказаць, што мы схіляем галаву ў пашане перад памяцьцю гэтага выдатнага чалавека. Сваім аграмадным укладам у вольную беларускую навуку ды ў справу вызваленьня Беларусі ён, безумоўна, прыблізіў сам момант, калі беларускі народ нарэшце ўстане ў поўны рост як гаспадар у сваім вольным і незалежным доме", а др. Янка Запруднік у нэкралёгу "Сьпі, Працаўнік і Змагар" напісаў: "Яшчэ ў нядзелю ён дзяліўся са старшынём Галоўнае Ўправы БАЗА сп. Шукелойцем, частым наведывальнікам яго



Як ведама, у 20-30 гг. XX ст. Вільня была галоўным цэнтрам беларускага культурна-грамадзкага жыцьця ў Заходняй Беларусі. Тут працавала Віленская Беларуская Гімназія, Беларускі Музэй імя Івана Луцкевіча, Беларускае навуковае таварыства, Інстытут гаспадаркі й культуры, Беларускі народны дом, Беларускі пасольскі клюб, Беларускі каапэратыўны банк, беларускія выдавецтвы ды іншыя арганізацыі. Выдаваліся шматлікія беларускія газэты, часопісы, кнігі. Паводле савецкага дасьледчыка Говіна ў тым часе ў Вільні выходзіла каля 2000 назоваў бел. газэтаў і часопісаў, зразумела, не ў вадначасьсе: пасьля канфіскаты газэты й арышту ейнага рэдактара, што ў міжваеннай Польшчы здаралася досыць часта, газэта мяняла свой назоў, шукаўся новы рэдактар (як тады казалі — "зіцрэдактар") і газэта выходзіла далей. Згодна статыстыкі Віленскага Ўнівэрсытэту бел. прэса займала другое мейсца колькасьцю асобнікаў і назоваў пасьля афіцыйнай польскай прэсы.

З усёй Заходняй Беларусі ў Вільню зьяжджаліся юнакі й дзяўчаты, каб атрымаць спачатку сярэднюю адукацыю ў ВБГ, а пасьля, калі пашчасьціць, паступіць у Віленскі Ўнівэрсытэт імя Стэфана Баторыя ці ў Карлаў Унівэрсытэт у Праге . Пасьля сканчэньня названых унівэрсытэтаў, а часта й здабыўшы навуковую ступень, шмат якія іхныя выпускнікі заставаліся жыць і працаваць у Вільні, папаўняючы шэрагі беларускай інтэлігенцыі, сярод каторай тады было й чацьвёра беларускіх дзеячоўадраджэнцаў з роду Станкевічаў.

Найстарэйшы са Станкевічаў, таксама Станіслаў, празваны ў віленскім беларускім асяродзьдзі "Кнігаром", меў прыватную бел. кнігарню на вул. Вострабрамскай, пісаў вершы, выдаў пры жыцьці два вершаваныя зборнічкі "Сьмех ня грэх" і "З майго ваконца", разам зь пісьменніцай Зоськай Верас выдаваў беларускія адрыўныя календары.

Наступны з Станкевічаў, кс. Адам Станкевіч — "ксёндз Адам", як ласкава называлі яго вучні ВБГ — зьяўляўся, напэўна, самым знакамітым з Станкевічаў у міжваеннай Вільні: нязломны змагар за беларускую мову ў сьвятынях, таленавіты публіцыст, выдатны пэдагог, мэцэнат. Загінуў у сталіноўскіх лягерох.

Трэці, Янка Станкевіч, "Спадар" — ці ня першы пачаў уводзіць у нашую мову стаўшыя сёньня нармальнымі звароты "спадар" і "спадарыня". Тадыж яны не прыжыліся, але моцна прыліплі да іхнага аўтара. Я. Станкевіч належыў да г. зв. "пражанаў", г. зн., што ён закончыў унівэрсытэт у Празе. У Вільню вярнуўся з ступеняй доктара навукаў і займаўся беларускай філялёгіяй.

І, нарэшце, наймаладзейшы з Станкевічаў, Станіслаў (Стась) Станкевіч, быў доктарам філязофіі й славістыкі, ведамым публіцыстам і літаратуразнаўцам.

Усе гэтыя Станкевічы паходзілі зь вёскі Арляняты Ашмянскага павету й былі ў бліжэйшым ці далейшым сваяцтве. Стась Станкевіч нарадзіўся 23 лютага 1907 г. у сялянскай сям'і. Ягоныя бацькі Язэп і Эмілія (з дому Станкевічанка, родная сястра Янкі Станкевіча) мелі сваю гаспадарку. Пасьля заканчэньня ў 1921 г. пачатковай адукацыі Стась паступіў у ВБГ. У тым часе ў гімназіі працавалі такія выдатныя пэдагогі, як Алёна Сакалова-Лекант, Максім Гарэцкі, Антон Луцкевіч, Аркадзь Смоліч ды інш. Яны здолелі стварыць у гімназіі сапраўдную бел. атмасфэру пры поўнай рэлігійнай і нацыянальнай талерантнасьці. Гімназія была прыватная, ейнымі канцэсіянэрамі былі: спачатку Беларускае навуковае таварыства, пасьля — Бацькоўскі камітэт. Гэта, з аднаго боку, давала большую незалежнасьць, але, з другога боку, прыватныя гімназіі ў тагачаснай Польшчы ня мелі "правa матуры", што не дазваляла ейным абсальвэнтам атрымаць вышэйшую адукацыю. ("Права матуры" ВБГ, застаючыся прыватнай гімназіяй, дамаглася ў 1928 г.). Таму Стась Станкевіч, правучыўшыся ў ВБГ да 1926 г., апошнюю клясу канчаў у Вялейскай дзяржаўнай польскай гімназіі ймя. Г. Сянкевіча, пасьля сканчэньня якой у 1927 г. атрымаў "матуру" — права паступаць у ВНУ Польшчы. Яму ўдалося паступіць на гуманітарны факультэт Віленскага Ўнівэрсытэту. Хаця й ня проста было беларусу (як, зрэшты, і іншым прадстаўнікам няпольскай нацыянальнасьці) паступіць ва ўнівэрсытэт, тым ня менш на Віленскім Унівэрсытэце вучылася 60-70 беларускіх юнакоў і дзяўчатаў. Яны вучыліся на розных факультэтах, але былі аб'яднаныя ў Беларускі Студэнцкі Саюз, які выдаваў і свой часопіс "Студэнцкая думка". Ст. Станкевіч быў актывістам БСС, уваходзіў ва ўрад Таварыства беларусаведы, быў ягоным старшынём.





*Выступ на канфэрэнцыі ў Інстытуце вывучэньня СССР. Мюнхен, пач. 60-х гг.*

друку аб'ектам перасьледу й цкаваньня. Асабліва шчыравалі Мікола Сташкевіч і Алесь Бажко. Апошні ў сваім пасквілі "Татальнае Банкруцтва" (інакш ягоны "твор" не назавеш) не шкадуе эпітэтаў, каб ачарніць дзейнасьць і асобу Ст. Станкевіча ад часоў ягонай навукі на Віленскім Унівэрсытэце й да ягонай працы ў якасьці рэдактара "Беларуса". У 1968 г. Станкевіч апублікаваў у "Беларусе" (№ 137) свой адказ ЦК КПБ, у каторым ясна выказвае сваю пазыцыю: "Як і велізарная колькасьць маіх суродзічаў на Бацькаўшчыне, я ня больш і ня менш, як глыбока перакананы беларускі патрыёт, і, як гэткі, сьмяротны вораг штучна створанага гэтак званага савецкага патрыятызму, што на самай рэчы не становіць сабою нічога іншага, як выяў традыцыйнага расейскага нацыяналізму й каляніялізму, адно захварбаванага ў абставінах Беларусі некаторымі лякальнымі беларускімі рысамі".

Працуючы рэдактарам "Беларуса", Ст. Станкевіч спатыкаўся з рознымі ацэнамі свае дзейнасьці. Некаторыя лічылі, што ён "Беларуса" вядзе па-дыктатарску. В. Жук-Грышкевіч адзначыў у сваіх успамінах: "Міцкевіч цьвердзіў, што "Беларуса" ён (Ст. Ст.) вядзе па-дыктатарску, але пакуль вядзе, трэба гэтую газэту падтрымліваць". У іншым мейсцы ён занатоўвае: ""Беларус" — гэта Станкевіч", падкрэсьліваючы гэтым ролю Станкевіча як рэдактара й аўтара шматлікіх артыкулаў.

Ад часу пераезда ў Амэрыку й амаль да самай сьмерці Ст. Станкевіч быў сталым супрацоўнікам Беларускай службы радыё "Свабода". Ён рабіў перадачы на тэмы беларускай культуры й літаратуры, у выніку чаго ў



*Зінаіда й Станіслаў Станкевічы з дачкой Раяй. Мюнхен, 1955 г.*

Купалы, а вышэйшую ва ўнівэрсытэтах Бэльгіі й Англіі, — эмігравалі ў ЗША. У 1962 г. Ст. Станкевіч таксама пераехаў у Амэрыку, дзе ўжо жыла ягоная сям'я, жонка й дачка. Станкевічы жылі стала ў Нью Ёрку, дзе была немалая грамада беларусаў. Ст. Станкевіч адразу ўключыўся ў працу. Улетку 1963 г. ён быў абраны старшынём Беларуска-Амэрыканскага Зьедзіночаньня (БАЗА). Гэтае становішча ён займаў да 1965 г. У канцы 1963 г. бярэ на сябе абавязкі рэдактара газэты "Беларус". Гэтая газэта была заснаваная ў 1950 г. і зь цягам часу стала газэтай усіх беларусаў заходняга сьвету. Газэта была ворганам БАЗА, паводле свайго характару яна была дэмакратычнай, паказвала ня толькі жыцьцё беларускай дыяспары Амэрыкі, але й беларусаў у БССР, Заходняй Эўропе, Аўстраліі, Паўдзённай Амэрыцы й Канадзе. Газэта ня толькі выкрывала злачынны характар савецкага рэжыму й апісвала штодзённае жыцьцё беларусаў за межамі БССР, але была й адзінаю крыніцаю поўнай і праўдзівай інфармацыі пра бел. нацыянальнае адраджэньне й незалежніцкі рух на Бацькаўшчыне. Няма такое бел. тэмы або праблемы, якія не знайшлі-б свайго адлюстраваньня на старонках "Беларуса".

Ст. Станкевіч быў рэдактарам "Беларуса" ад канца 1963 г. да апошніх дзён жыцьця. Як рэдактар газэты й аўтар шматлікіх артыкулаў і выступленьняў на ейных старонках Ст. Станкевіч быў у бээсэсэраўскім





*10-ыя ўгодкі з дня сьмерці Івана Луцкевіча. У верхнім радзе: Ст. Станкевіч (чытае рэфэрат), А. Нэканда-Трэпка, Я. Цеханоўскі (дырэктар Навагрудзкай гімназіі), А. Луцкевіч, Р. Шырма, невядомы, Я. Станкевіч, Б. Туронак. 1929 г.*

Гартаючы пажоўклыя ад часу нумары "Студэнцкай думкі", там часта можна сустрэць артыкулы й допісы Стася Станкевіча, а ў "Хроніцы" часопісу — пералік ягоных лекцыяў і рэфэратаў. Так, у 1929 г. ім быў прачытаны рэфэрат "Мэты беларускага студэнцтва" й другі, прысьвечаны памяці Івана Луцкевіча ў 10-ыя ўгодкі ягонай сьмерці. У 1930 г. на 10-годзьдзе заснаваньня БСС ён выступіў з рэфэратам "Гісторыя беларускага студэнцкага руху". Станіслаў Станкевіч бярэ ўдзел у г. зв. "сьродах літэрацкіх", ладжаных Саюзам польскіх літэратараў, дзе выступае з дакладамі пра беларускую літаратуру Заходняй Беларусі.

Ст. Станкевіч вывучае польскую літаратуру зь бел. пункту гледжаньня. Яго цікавяць ня толькі тыя паэты й празаікі, каторыя пісалі як на польскай, так і на беларускай мовах (У. Сыракомля, А. Плуг), але й чыста польскамоўныя пісьменьнікі, што нарадзіліся на беларускіх землях. Ён шукае ў іхных творах уплыву беларускай стыхіі: на тэматыку, стылістыку, мову. У сваёй магістэрскай працы "Żywioł białoruski w twórczości Elizy Orzeszkowej" ("Беларуская стыхія ў творчасьці Элізы Ажэшкі") малады філёляг разглядае творчасьць Э. Ажэшкі. Пасьля абароны Станкевіч і надалей працуе над абранай ім тэмай. Зь некаторымі сваімі досьледамі й высновамі ён знаёміць беларускую грамадзкасьць Заходняе Беларусі,



*Беларускі Студэнцкі Саюз у Вільні. Станіслаў Станкевіч — другі зьлева ў другім радзе. 1930-я гады.*



Станкевіч добра разумеў, што бязь веданьня ангельскае мовы абыйсьціся нельга. Ён вучыцца на настаўніцкіх курсах ангельскае мовы пры Саюзе Цэркваў у Вульме, а пасьля выкладае пачаткі анг. мовы для беларусаў перасяленчага лягеру ў Розэнгайме. Горад Розэнгайм ляжыць у прыальпійскай даліне над рэчкаю Ін на паўднёвы ўсход ад Мюнхену. Сюды былі пераселеныя беларусы зь лягероў Відышбергердорф, Остэргофэн, Альтэнтац і Шляйсгайм. Апрача беларусаў былі тут і іншыя нацыянальныя групы. Іх адносіны да беларусаў былі розныя. Цёплыя склаліся толькі з сэрбамі, пасьля таго, як др. Ст. Станкевіч прачытаў для сэрбскай часткі працоўнага лягеру лекцыю з гісторыі сэрбскае літаратуры на сэрбскай мове, якую ён ведаў з часоў, калі год стажыраваўся на навуковай стыпэндыі ў Югаславіі.

Пакінуўшы пэдагагічную працу, др. Станкевіч бярэ актыўны ўдзел у працы Беларускага Нацыянальнага Камітэту ў амэрыканскай акупацыйнай зоне, супрацоўнічае з прэзыдэнтам Рады БНР Міколам Абрамчыкам. Ён рэдагуе часопіс "Рух", а ад 1948-га ажно да 1962 г. — часопіс "Бацькаўшчына". У сваіх успамінах В. Жук-Грышкевіч піша: "Пакуль "Беларускі эмігрант" не выходзіць, "Бацькаўшчына" можа быць выкарыстаная для ўсіх вашых абвестак і справаздачаў. Стась (др. Станкевіч) і ўсе тут гэта-ж вашыя сапраўдныя аднадумцы". Як і ў віленскі пэрыяд свайго жыцьця Ст. Станкевіч выступае зь лекцыямі, рэфэратамі. Жук-Грышкевіч занатоўвае ў сваіх успамінах: "У 1956 г. было сьвяткаваньне 25 Сакавіка, даклад меў Ст. Станкевіч. У прыгожай вялікай залі было шмат людзей, між імі й старэнькі ўжо праф. Кошмідэр зь Віленскага Ўнівэрсытэту, некалі апякун Беларускага Саюзу Студэнтаў у Вільні".

Ст. Станкевіч праяўляе сябе як вельмі добры арганізатар. Зь ягонай ініцыятывы была створаная філія Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва ў Нямеччыне (БІНІМ) , ён рэдагаваў і тыя нумары "Запісаў", што выходзілі ў Нямеччыне. У заснаваным у 1954 г. у Мюнхене Інстытуце вывучэньня СССР ён выконваў функцыі навуковага сакратара (1954-56 гг.), віцэстаршыні (1956-58 гг.), старшыні (1958-61гг.) Навуковай Рады, навуковага сакратара й дырэктара інстытуту (1961-62 гг.). Рэдагаваў "Беларускі зборнік" і манаграфіі Інстытуту ў галіне беларусазнаўства. Але ні адміністрацыйная, ні рэдактарская праца не замінае яму займацца літаратурнымі досьледамі, літаратурнай крытыкай і публіцыстыкай. Ягоная працаздольнасьць і энэргія невычарпальныя.

Нямеччына была пераходным, хаця й доўгім этапам у жыцьці й творчасьці Ст. Станкевіча. Беларусы старэйшага й маладзейшага пакаленьняў, тыя што здабылі сярэднюю адукацыю ў Гімназіі ймя Янкі



*На сьвяткаваньні 25-годзьдзя ВБГ.*
*Станіслаў Станкевіч — другі зьлева ў другім радзе. 1944 г.*

патрапіў у бяду. Так ён дамогся вызваленьня бел. пісьменьніка Міхася Клімковіча, старшыні Саюза пісьменьнікаў БССР, якога немцы ўзялі ў палон разам з савецкімі партызанамі на Барысаўшчыне. За такія дзеяньні можна было заплаціць жыцьцём або трапіць у канцлягер.

У 1944 г. ВБГ сьвяткавала сваё 25-годзьдзе. Нягледзячы на неспрыяльны час — фронт імкліва каціўся на Захад — у Вільні сабралася шмат абсальвэнтаў гімназіі з розных куткоў Беларусі. Прыехалі Н. Арсеньева, Б. Кіта, Я. Станкевіч, Я. Калубовіч, Ю. і Л. Луцкевічы, А. Шантыр, Л. Шырма ды шмат хто яшчэ. Прыехаў і др. Ст. Станкевіч. Гэта было ягонае апошняе спатканьне зь Вільняй… Усе, хто працаваў на бел. культуру ці займаў якія становішчы ў адміністрацыі, ставілі тады пытаньне "Што рабіць?" Застацца ў Беларусі азначала арышт, сьмяротны прыгавор або лягер. Заставалася эміграцыя. Гэты шлях абраў і Станіслаў Станкевіч з жонкай.

Першым этапам у ягоным жыцьці на эміграцыі была Нямеччына. Спачатку ён спыняецца ў Бэрліне, дзе ад палавіны 1944 г. да пачатку 1945 г. рэдагуе бел. газэту "Раніца". Пасьля пераяжджае ў Баварыю, якая неўзабаве апынулася ў амэрыканскай акупацыйнай зоне. Тут сабралася шмат беларусаў і Ст. Станкевіч адразу ўключыўся ў працу бел. арганізацыяў. У 1945-47 гг. ён выкладае бел. літаратуру ў Беларускай Гімназіі ймя Янкі Купалы ў Рэгенсбургу. Ягоная жонка выкладала прыродазнаўства. Гімназія адыйграла вялікую ролю ў фармаваньні сьвядомай бел. інтэлігенцыі на эміграцыі.





*Вечар беларускай паэзіі й песьні. Сядзяць: Стась Станкевіч, Міхась Машара, Рыгор Шырма, Міхась Васілёк, Мікола Шчорс; стаяць: Хведар Ільяшэвіч, Максім Танк, Вітаўт Тумаш, Пётра Сергіевіч. 15 сакавіка 1936 г.*

KAMUNIKAT.org

перадусім Вільні. Так, у 1935 г. ён выступае зь лекцыяй "Беларускія фальклёрныя элементы ў балядах А. Міцкевіча". А ў 1936 г. выходзіць з друку ягоная кніжка "Первясткі бялоруске в польскей поэзы романтычнэй" ("Беларускія элементы ў польскай рамантычнай паэзіі"). За гэтую кнігу сэнат Віленскага Ўнівэрсытэту прысудзіў яму (пасьля здачы неабходных экзаменаў) ступень доктара філязофіі ў галіне польскай і славянскай філялёгіі.

Станіслаў Станкевіч яшчэ ў студэнцкія гады арганічна ўліўся ў бел. грамадзка-культурны рух. Ён шмат піша, друкуючыся ў "Калосьсях", "Нёмане", "Маладой Беларусі", "Студэнцкай думцы", выступае з рэфэратамі на літаратурных вечарынах, якія час ад часу ладзіліся беларусамі-віленчукамі на кватэры інжынера Антона Нэканды-Трэпкі. Малады, адукаваны, таленавіты публіцыст вылучаецца глыбінёй аналізу, ягоныя артыкулы напісаныя жывой прыгожай бел. мовай, лёгка чытаюцца.

У 1934-37 гг. Ст. Станкевіч працуе настаўнікам польскай мовы й літаратуры ў розных школах Заходняй Беларусі. Іронія лёсу (штопраўды, дзеля кавалка хлеба) ён, шчыры беларус, змушаны быў выкладаць бел. дзецям мову акупанта! Але сувязь зь Вільняй не парываецца. Ён мае ў Вільні шматлікіх сяброў, сярод іх і пачынаючага, але ўжо дастаткова




*Дэдыкацыя Максіма Танка Станіславу Станкевічу на звароце фатаздымка паэта ад 20 сакавіка 1937 г.*

ведамага паэта Максіма Танка. У 1937 г. М. Танк падараваў яму сваю фатаграфію з дэдыкацыяй "Стасю — як успамін супольнай працы й змаганьня за свабоду, за правы творчага жыцьця роднай паэзіі — Максім. Вільня 1937г. 20-III". Здаецца, паміж імі, не зважаючы на рознасьць у поглядах ды палітычнай арыентацыі, было шчырае сяброўства. Тым больш зьдзіўляе той факт, што ў сваім дзёньніку "Лісткі календара" за 1935-39 гг. Танк нідзе не ўзгадвае ймя Ст. Станкевіча. Успамінае Адама й Янку Станкевічаў (праўда, апошняга даволі зьдзекліва), Янку Шутовіча, Сяргея Паўловіча, Марыяна Пецюкевіча, ужываючы крыптонім П., бо толькі Пецюкевіч, каторы працаваў тады ў Бібліятэцы Ўрублеўскіх, мог даваць Танку чытаць літаратуру, выдадзеную ў БССР. (Зрэшты, сам Пецюкевіч піша пра гэта ў сваіх успамінах у кнізе "У пошуках зачараваных скарбаў" (выдавецтва "Рунь", Вільня, 1998)). Тлумачэньне тут толькі адно: "Лісткі календара" былі здадзены ў друк у 1969 г., і цэнзар, а можа, і сам аўтар, выкрэсьлілі ўсё, што было зьвязанае з Стасем Станкевічам, эмігрантам, які тады сваім пяром і далей змагаўся за незалежнасьць Беларусі. Беларускі дасьледчык др. філ. Арсень Ліс, які апрацаваў каментары да "Лісткоў календара", меў нагоду бачыць і іхны рукапіс. Ён падцьвярджае, што ў рукапісу ёсьць цэлыя абзацы, прысьвечаныя Ст. Станкевічу.

Ст. Станкевічу й М. Танку давялося спаткацца яшчэ раз, у Манрэалі.



Пра гэта ўспамінае Вінцэнт Жук-Грышкевіч: "У 1967 г. у часе Беларускага тыдня на ЭКСПО я запытаўся ў Танка: "Як Вы маглі напісаць, што "Маладая Беларусь" выдавалася за польскія грошы? Вы-ж ведаеце, што гэта было ня так!" — "А хто Вам сказаў, — гаворыць Танк, — што гэта напісаў я?" М. Танка хуценька ад нас забралі. Ст. Ст. пасьпеў толькі сказаць, пасьміхіваючыся да Танка: "Ну, браток…" Яны былі сябры ў Вільні".

У 1937 г. Ст. Станкевіч атрымаў стыпэндыю дзеля вывучэньня паўднёваславянскіх моваў і літаратураў. У 1937-38 гг. ён плённа працуе ў Югаславіі й Балгарыі. Вярнуўшыся на радзіму, зноў працуе настаўнікам Дзісьненскай польскай гімназіі.

Польска-нямецкая вайна зьмяніла палітычную мапу Эўропы. Заходняя Беларусь была далучаная да БССР, Вільню й Віленскі край Сталін "падараваў" Літве. У 1939 г. Станкевіч працуе выкладчыкам Беларускага настаўніцкага інстытуту ў Навагрудку. У тым самым годзе ён ажаніўся, жонкай ягонай стала Зінаіда Сініцына, якая закончыла матэматычна-прыродазнаўчы факультэт Віленскага Ўнівэрсытэту з тытулам магістра батанікі. Нейкі час яна працавала асыстэнтам катэдры батанікі ва ўнівэрсытэце, а пасьля настаўніцай у польскіх гімназіях у Нясьвіжы, Шчучыне й Навагрудку.

У 1941 г. пачалася савецка-нямецкая вайна. Сьвядомыя беларусы імкнуліся выкарыстаць некаторыя магчымасьці, каб стварыць ва ўмовах нямецкай акупацыі бел. школьніцтва, замацавацца ў адміністрацыі, адрадзіць рэлігійнае й культурнае жыцьцё, а перадусім — выкарыстоўваць усе магчымасьці, каб бараніць беларусаў арыштаваных немцамі, часта паводле фальшывых даносаў. Многія зь бел. дзеячоў міжваеннага часу ўсклалі на свае плечы гэтую нялёгкую працу. Др. Станіслаў Станкевіч пакідае навуковую й пэдагагічную працу й пераходзіць у адміністрацыю. Спачатку ён займае становішча старшыні Барысаўскай акругі, а пасьля стварэньня Беларускай Цэнтральнай Рады — намесьніка прэзыдэнта БЦР на Баранавіцкую акругу. На гэтых становішчах Ст. Станкевіч паказаў сябе ня толькі добрым арганізатарам, але й мужным чалавекам, каторы ў жахлівых варунках нямецкай акупацыі здабыў пашану мяйсцовага насельніцтва. У архіве Ст. Станкевіча захавалася кніжка ўспамінаў бел. жыдоў, што зьнішчаліся гітлероўцамі пагалоўна на ўсіх акупаваных абшарах. У кніжцы згадваецца й др. Станкевіч, які рабіў захады перад нямецкім генэралам, дамагаючыся адкласьці ліквідацыю жыдоўскага гета, аргумэнтуючы гэта лаяльнасьцю жыдоўскага насельніцтва да ўладаў. Калі ягоныя захады не далі вынікаў, чаго й трэба было спадзявацца, ён папярэдзіў жыдоўскі актыў пра ліквідацыю гета, а сам выехаў з Барысава.

Ст. Станкевіч падчас ваеннага ліхалецьця дапамог шмат каму, хто